ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
Брылёўская сельская бібліятэка

# КАБ ГУЧАЛА СЛОВА ЗЕМЛЯКОЎ

## Літаратурнае краязнаўства

Copyright © Wondershare Software

Брылёўская сельская бібліятэка ў сва-
ёй працы надае вялікую ўвагу літара-
турнаму краязнаўству. Вядзецца да-
следчая і выдавецкая дзейнасць, пра-
водзяцца масавыя мерапрыемствы для
наведвальнікаў бібліятэкі.

Copyright © Wondershare Software

Шмат што робіцца ў супрацоўніцтве з Брылёўскім сельскім Домам культуры. Дзякуючы гэтаму выпрацоўваюцца прыя-рытэты для дасягнення агульнай мэты — павышэння культурнага і інтэлектуальнага ўзроўню наведвальнікаў і ўдзельнікаў мерапрыемстваў.

Copyright © Wondershare Software

# Масавыя мерапрыемствы

Масавыя мерапрыемствы праводзяцца сумесна з Брылёўскім сельскім Домам культуры.






**100-годдзе Якуба Усікава**

Copyright © Wondershare Software

# Масавыя мерапрыемствы





## 60-годдзе
## Міколы Яцкова

Copyright © Wondershare Software

# Масавыя мерапрыемствы



## 95-годдзе Васіля Карпечанкі






Copyright © Wondershare Software

# Масавыя мерапрыемствы







## 80-годдзе
## Яраслава Клімуця

Copyright © Wondershare Software

# Выдавецкая дзейнасць

Для папулярызацыі жыцця і творчасці пісьменнікаў і знакамітых людзей Магілёўскага краю бібліятэка выпускае бібліяграфічныя паказальнікі, біяграфічныя і інфармацыйныя буклеты.




**Якуб Усікаў**




**Аляксей Пысін**

Copyright © Wondershare Software

# Выдавецкая дзейнасць




Алесь Пруднікаў




Міхась Карпечанка




Уладзімір Фамін

Copyright © Wondershare Software

# Выдавецкая дзейнасць



Ракаў, В.
Неданошаныя кашулі [Тэкст]. Бацькаўшчына. Трасліўка: вершы / Віктар Ракаў // Анталогія беларускай паэзіі. У 3 т. Т. 3. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. — С. 129-131.

Ракаў, В.
Пад крэп-дзеразою, пад ядзерам... [Тэкст]: нарыс / Віктар Ракаў // Маладосць. — 2000. — № 8. — С. 222-232.

Ракаў, В.
Пад тымі ж копамі... [Тэкст]. На родным парозе: вершы / Віктар Ракаў // Дзень паэзіі - 88. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. — С. 117-118.

*Група маладых пісьменнікаў на нарадзе рэдакцыі часопіса "Маладосць". Справа налева: Сымон Блатун, Генадзь Бураўкін, Уладзімір Скапа, Яўген Крупенька, Уладзімір Паўлаў, Віктар Ракаў, Раман Тармола, Хведар Майсейшын. 1957 г.*

*Злева направа: Кастусь Цвірка, Мікола Кусянкоў, Алесь Пісьмянкоў, Віктар Ракаў, Генадзь Пашкоў. Мінск, 1985 г.*

ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
Брылёўская сельская бібліятэка

Старонкі маёй налеў
**Да 85-годдзя Віктара Ракава**
***Інфармацыйны буклет***

**Віктар Ракаў**

Copyright © Wondershare Software

# Выдавецкая дзейнасць



Марціновіч, А.
Сцюжа [Тэкст]: аповесці / Аркадзь Марціновіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. — 270 с.: іл.

Мартинович, А.
Травинка и камень [Текст]: повести / Аркадий Мартинович; перевод с белорусского; послесловие М. Мушинского; художник О. Назаренко. — Минск: Мастацкая літаратура, 1990. — 462 с., [1 партр.].

Марціновіч, А.
Чырвоныя ветразі [Тэкст]: вершы / Аркадзь Марціновіч. — Мінск: Беларусь, 1965. — 64 с.

**Пра Аркадзя Марціновіча**

Аркадзь Марціновіч [Тэкст] // Беларускія пісьменнікі (1917-1990): даведнік / складальнік А. К. Гардзіцкі. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. — С. 366-367.

Аркадзь Марціновіч [Тэкст] // Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведнік. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. — С. 230-231.

Карлюкевіч, А.
Разгледзець чалавечнасць [Тэкст]: творчыя абсягі Алеся Марціновіча / Алесь Карлюкевіч // Роднае слова. — 2006. — № 8. — С. 26.

Марціновіч Аркадзь [Тэкст] // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. Т. 4: Лазарук — Перкін / пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса; Рэдкалегія: І. Э. Багдановіч і інш. — Мінск: БелЭН, 1994. — С. 231-235.

Марціновіч Аркадзь Нічыпаровіч [Тэкст] // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 10: Малайзія — Мугаджары / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў і інш. — Мінск: БелЭН, 2000. — С. 148.

Марціновіч Аркадзь Нічыпаровіч [Тэкст] // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. Т. 3: Карчма — Найгрыш / Рэдкалегія: І. Шамякін (гал. рэд.) і інш. — Мінск: БелЭН, 1986. — С. 450.

ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
Брылёўская сельская бібліятэка

«Не шукай слядоў сваіх»
Да 100-годдзя
Аркадзя Марціновіча
(1920 – 2009)

## Аркадзь Марціновіч

Copyright © Wondershare Software

# Сумесная выдавецкая дзейнасць

Для больш шырокай папулярызацыі сабраных краязнаўчых і этнаграфічных матэрыялаў маецца вопыт выдавецкай дзейнасці. Па ініцыятыве дырэктара Брылёўскага сельскага Дома культуры Яцкова Мікалая Адамавіча выдаваліся інфармацыйныя бюлетэні **“Брылёўскі летапіс”**, **“Брылёўская мінуўшчына”** і **“Брылёўскі вернік”.**




Copyright © Wondershare Software

# Сумесная выдавецкая дзейнасць



КРЫЛЕЎСКАЯ МІНУЎШЧЫНА

ГРАМАДСКА-ГІСТАРЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

СПРАВА

Выдаецца з верасня 2006 г.

№ 2 ( 2 ) верасень 2006 г.

с.2-3 Жыццёвыя вёрсты Марыі Халмовай

с.4-5 Сведкі гісторыі

с.6 Невядомае і таемнае

с.8 АрхіВЫ



КРЫЛЕЎСКІ ВЕСНІК

ІНФАРМАЦЫЙНА • ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца са студзеня 2010 г.

№ 3 ( 3 ) жнівень 2010 г.

## СУД

Як настане час і Судны дзень
Нас на пакаянне ўсіх пакліча,
То лічына з кожнага спадзе,
Кожнае адкрыецца аблічча.
Колькі будзе голых каралёў,
Колькі раптам адусюль паўстане
Вырадкаў, хлусліўцаў, халуёў,
Падхалімаў у высокіх званнях!
Яшчэ больш убачыцца рабоў
Па прымусу і добраахвотных,
Хто заўжды і ўсюды ўраз гатоў
На любую подлую работу.
Маскі ўсё ж – не вечныя – спадуць
Некалі; грахі пакажуць вушы.
І настане найвышэйшы Суд
Боскі суд і жах у чорных душах.

*Алег САЛТУК*

## СПАСительный август

С давних пор этот месяц считается лучшим в году для проведения праздников и торжеств. Август богат на знаменательные и любимые христианским миром праздники Православной церкви.

Вторая половина месяца начинается и заканчивается праздниками Спаса. По православному календарю 14 августа первый Спас - Спас Маковей, названный так по имени братьев Маковеев - первых мучеников за Христа. Церковь отмечает его как праздник Происхождения Честных Древ Животворящего Креста Господня. В храмах совершается в этот день поклонение Кресту. С этого дня начинается Успенский пост, а также вспоминается Крещение Руси 14 августа 988 года, что сопровождается малым освящением воды. Вместе с водой освящается и мёд нового сбора. Отсюда и другие названия праздника: «Мокрый Спас», «Медовый спас».

Второй Спас – праздник Преображения Господня (19 августа) христиане считают праздником света, днём открытия тайны, заключающей в себе двух естеств в Христе - человеческого и божественного. Преображение Христа произошло в дни еврейского Праздника кущей, когда благословлялись плоды нового урожая. В нашем народе бытует название этого праздника, как «Спас яблочный». На преображение в Церкви освящаются яблоки. виноград и другие плоды нового урожая.

Третий Спас празднуется 29 августа, как Перенесение Нерукотворного Образа Спасителя, т.е. ткани, на которой проявился Лик Иисуса Христа, По преданию, Образ отпечатался на убрусе (чистом плате), когда Спаситель утёр им своё лицо. Так возник «Нерукотворный образ».

Третий - Малый Спас - в народе называется «Хлебным», «Ореховым», потому что к его приходу заканчивается жатва и выпекаются хлеб, булки со свежего урожая, поспевают лесные орехи. А народная примета гласит: *«По Спасе держи рукавицы в запасе»* – начинаются первые холода.

Copyright © Wondershare Software

# Серыя брашур «Мінуўшчына»

Краязнаўчы праект **“Мінуўшчына. Гартаючы пажоўклыя старонкі…”** – серыя брашур.

Складзены па матэрыялах дарэвалюцыйных выданняў, якія асвятлялі жыццё і падзеі нашага Прыдняпроўскага краю.

На сённяшні дзень маецца 53 выпускі серыі, і праца працягваецца.




Copyright © Wondershare Software

# Сумесная выдавецкая дзейнасць

Са снежня 2017 года ажыццяўляецца выпуск новага сумеснага бюлетэня **“Брылёўскі гасцінец”**, дзе размяшчаюцца матэрыялы аб праведзеных мерапрыемствах у бібліятэцы і Доме культуры.


Брылёўскі гасцінец
№ 15 верасень 2018 г.
"Куды б усе мы забрылі, Калі б не вёсачка Брылі ?.."
Выдаецца са снежня 2017 г.
Інфармацыйны бюлетэнь Брылёўскай сельскай бібліятэкі і Брылёўскага сельскага Дома культуры Магілёўскага раёна

Цуд, імя якому КНІГА

Ваше Письмо

Адзначылі юбілей пісьменніка

ЦУД, ІМЯ ЯКОМУ КНІГА

ПАДЗЯКА

Copyright © Wondershare Software

# Сумесная выдавецкая дзейнасць

Важнай часткай гэтага выдання з'яўляецца пастаянная рубрыка **«Старонкі гісторыі Брылёўскага краю»**, дзе публікуюцца запісаныя ў этнаграфічных экспедыцыях успаміны жыхароў нашых вёсак пра розныя перыяды мясцовай гісторыі.

Ужо выпушчана 19 нумароў «Брылёўскага гасцінца», і праца працягваецца.


6 | № 2 студзень 2018 г.

Старонкі гісторыі Брылёўскага краю

Успамінае
Надзея Дзмітрыеўна АРЦЮШЭНКА

Земля, на которой расположены деревни Подлесье и Брыли, принадлежала пану Константиновичу. Он жил в большом деревянном доме, с множеством сараев, была парня, много слуг. Рядом было имение другого пана (имя его не помнит никто). Он был очень богатый, и у него было ещё одно имение в Любуже. Паны-соседи дружили. У пана Константиновича был сын, а у этого пана была дочь (она была горбатенькая). Паны решили породниться и поженить своих детей. Пан отдал свою дочь за сына пана Константиновича, а впридачу имение в Брылях и кирпичный двухэтажный недостроенный дом (который после стал школой). Имение Константиновича удвоилось. А отец-пан уехал жить в своё другое имение. Земли у Константиновича было много: ему принадлежал лес, речка, мельница, множество подсобных помещений. После Октября они стали колхозными, а во время войны их разрушили. Старый Константинович умер и всё имение осталось молодому пану и невестке. Они жили в доме отца, а кирпичный двухэтажный дом достраивали. Дом достраивали медленно. Говорят, что пан много выпивал, играл в карты на деньги, а на своё имение внимания не обращал. Накануне революции (за 7-8 лет) пан стал продавать свои земли и уехал за границу. Свою горбатенькую жену он не взял. Где она, никто не знает. Только уехал он со своей любовницей Настенькой (она жила в деревне Качурино).

Его земли купили: Осмоловский, Парфененко, Богданов, Манкевич – мой дед (у нас сохранился план земельного участка). А остальную землю с недостроенным кирпичным домом купил Смоляров (Старый Смоляр). Имя его не помним, знаем, что переехал сюда из деревни Николаевка Шкловского района.

У старого Смоляра было четверо детей: сыновья Лаврентий и Алесь и дочери Марыля и Зося. У Лаврентия было 9 детей, а у Алеся 5 детей. Они построили себе дома в Подлесье, Новых Брылях (недалеко от школы). А кирпичный дом отстраивали.

Алеся потом раскулачили и расстреляли.

После Октября кирпичный дом у Смоляров забрали. В 1927 году он стал школой. А до этого на брылевской земле тоже были школы: первая школа была в деревне Качурино в сельской хате. Это было до революции. Здание этой школы не сохранилось. Вторая школа была в д. Брыли (где раньше был дом быта) – Матвейкина хата. Этот домик сгорел во время Великой Отечественной войны.

План земельного участка Емельяна Фомича Манкевича, деда Надежды Артюшенко

Стоят: Евдокия Манкевич, Софья Манкевич
Сидят: Дарья Манкевич, Емельян Манкевич.

Дмитрий Емельянович Манкевич, отец Надежды Артюшенко

"БРЫЛЁЎСКІ ГАСЦІНЕЦ"
Інфармацыйны бюлетэнь Брылёўскай сельскай бібліятэкі і Брылёўскага сельскага Дома культуры.
Адказны за выпуск - Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
e-mail: mikolabryl@gmail.com
Наклад 10 асобнікаў.

Copyright © Wondershare Software

# Інтэрнет-рэсурсы



У сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» размеш-чана старонка «Брылевская библиотека» (https://vk.com/ id468709446), якая рэгулярна запаўняецца інфармацыяй аб праведзеных мерапрыемствах, выдадзеных друкаваных выданнях і іншых навінах бібліятэкі. Анала-гічная інфармацыя размешчана ў сацыяль-най сетцы «Одноклассники» (https://ok.ru/ profile/538146964795).

Copyright © Wondershare Software

# Абмен вопытам

Пасля правядзення мерапрыемстваў з нагоды юбілею таго ці іншага пісьменніка інфармацыя адпраўляецца на сайты цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм тых месцаў, адкуль родам юбіляры. Матэрыялы размясцілі на сваіх інфармацыйных рэсурсах Слаўгарадская (аб К.Кірэенка), Уздзенская (аб А.Якімовічы), Мазырская (аб А.Федарэнка), Ушачская (аб Е.Лось), Зельвенская (аб У.Мазго) и Капыльская (аб М.Хведаровічы) раённыя бібліятэчныя сістэмы.




Copyright © Wondershare Software

Пятница
18.01.2019
13:20

Приветствую Вас **Гость**
RSS

# Узденская районная детская библиотека

Главная » 2019 » Январь » 18 » Памяць пра славутага земляка

**Памяць пра славутага земляка** 12:56



## "Памяць пра славутага земляка"

*Напярэдадні дня нараджэння нашага славутага пісьменніка-земляка Алеся Якімовіча на нашу пошту прыйшоў ліст з просьбай размясціць матэрыял Брылёўскай сельскай бібліятэкі Магілёўскага раёна аб правядзенні літаратурнай гадзіны "Сябра і настаўнік юных", прысвечанай 115-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка.*

*Вялікі дзякуй калегам за матэрыял і мы вельмі рады, што творчасць нашага земляка выклікае цікавасць у сучасных дзяцей і падлеткаў. Творчых вам поспехаў, калегі!*

***Знаёмцеся, калі ласка, з дасланым матэрыялам!***

Бібліятэкар Юлія Яцкова адзначыла, што Алесь Іванавіч Якімовіч нарадзіўся 17 студзеня 1904 г. у вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Ён зрабіў найвялікі ўнёсак у развіццё і станаўленне беларускай літаратуры для дзяцей, і на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў рабіў усё, каб маленькія беларусы мелі свае любімыя чытанкі. Менавіта Алесь Якімовіч стаяў ля вытокаў стварэння ў 1924 г. часопіса "Бярозка" (раней ён называўся "Беларускі піянер" і "Іскры Ільіча"), на старонках якога пачыналі свой творчы шлях многія беларускія літаратары.

На падрыхтаванай кніжнай выставе знайшлі сваё месца кнігі і публікацыі юбіляра. Удзельнікі сустрэчы Андрэй Шыпіцын, Макар Меляшкоў, Аліна Кавалёва, Аляксей Сіманькоў, Аляксандр Дайнека, Яўген Бірукоў і Сяргей Сіманькоў прачыталі вершы і казкі Алеся Якімовіча.

Дырэктар Брылёўскага сельскага Дома культуры Мікалай Яцкоў больш падрабязна спыніўся на дзяцінстве А.Якімовіча, яго неадольным імкненні да вучобы і кніжнага сусвету. І пакручасты лёс пісьменніка спрыяў гэтым памкненням — нават сам Якуб Колас выкладаў юнаму Алесю асновы літаратуры. І памяць пра гэтыя непаўторныя ўрокі Якімовіч пранёс праз усё жыццё.

Категория: Новости библиотеки | Просмотров: 2 | Добавил: uzdadb | Теги: Брылёўская сельская бібліятэка Маг, Узденская детская библиотека, А.Якімовіч, узда | Рейтинг: 0.0/0

Всего комментариев: **0**

ГУК Мозырская централизованная библиотечная система

## Пра час, асобу і народ

Сёлета святкуе свой юбілей знакаміты зямляк мазыран - пісьменнік Андрэй Федарэнка. Яго творчасць знаёма многім беларусам. Нашы калегі з Магілёўскай вобласці правялі цікавае мерапрыемства, з якім прапануюць пазнаёміцца ўсім карыстальнікам сайта.

23 студзеня 2019 г. ў *Брылёўскай сельскай бібліятэцы Магілёўскага раёна* прайшла літаратурная гадзіна ***«Пра час, асобу і народ»***, прысвечаная 55-годдзю вядомага беларускага пісьменніка Андрэя Федарэнкі.

Бібліятэкар Юлія Яцкова расказала пра жыццёвыя вехі і творчы лёс юбіляра, ураджэнца вёскі Бярозаўка Мазырскага раёна суседняй Гомельшчыны, і адзначыла, што наша літаратура атрымала ў асобе Андрэя Федарэнкі новае маладое дыханне, якое вельмі сугучнае тому высокаму ўзроўню, на які ўзнеслі беларускае прыгожае пісьменства больш старэйшыя літаратары. Андрэй Федарэнка заўсёды добра адчувае сябе ў розных жанрах - ад дзіцячай казкі да гістарычных і фантастычных апяведаў. А мы заўжды атрымліваем вялікае захапленне ад сакавітай шматвобразнасці гэтых твораў, добрай беларускай мовы і ўдумліва-паважлівых адносін пісьменніка як да сваіх літаратурных герояў, так і да чытачоў.

У выкананні Аліны Кавалевай, Аляксандры Івановай, Андрэя Шыпіцына і Аліны Куляшовай прагучалі творы Андрэя Федарэнкі.

Дырэктар Брылёўскага сельскага Дома культуры пісьменнік Мікола Яцкоў расказаў аб шматлікіх літаратурных узнагародах Андрэя Міхайлавіча і аб сваіх сустрэчах з гэтым вельмі сціплым, адкрытым і ветлівым чалавекам.

Прысутныя з вялікай цікавасцю пазнаёміліся з падрыхтаванай кніжнай выставай і з аўтографамі А.Федарэнкі для чытачоў Брылёўскай бібліятэкі.





«Ушачская централизованная библиотечная система»
Государственное учреждение культуры
Читайте в удовольствие!

## Галоўнае ў жыцці – жыццё

2 сакавіка ў Брылёўскай сельскай бібліятэцы Магілёўскага раёна адбылася літаратурная гадзіна, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння вядомай беларускай паэтэсы Еўдакіі Лось.




Бібліятэкар Юлія Яцкова адзначыла, што паэзія Е.Лось, якая нарадзілася ў першы дзень вясны, мае свае радзінныя вытокі на віцебскай Ушаччыне, адкуль у беларускую літаратуру годна ўвайшлі Пятрусь Броўка, Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін. І творчасць Еўдакія Лось заўсёды вызначалася прыгожым і мілагучным гучаннем родных слоў, глыбокай лірычнасцю і ўсхваляванымі пачуццямі. Лёс, на жаль, адмерыў паэтэсе толькі 48 гадоў жыцця, але яна паспела зрабіць свой яркі ўнёсак у беларускую літаратуру.







Прысутныя пазнаеміліся з падрыхтаванай кніжнай выставай і з відэапрэзентацыяй, прысвечанай жыццю і творчасці Е.Лось. Вершы Еўдакіі Якаўлеўны прагучалі ў выкананні чытачоў бібліятэкі Аліны Кавалевай, Зміцера Пацяробкіна, Вікторыі Крэсавай, Аляксея Сіманькова, Анастасіі Дубавой, Андрэя Шыпіцына і Аляксандра Дайнекі.

Дырэктар Брылёўскага сельскага Дома культуры Мікалай Яцкоў распавёў пра тое, што сваімі добразычлівымі парадамі Еўдакія Лось заўсёды дапамагала маладым беларускім паэтам, асабліва дзяўчатам – Яўгеніі Янішчыц, Раісе Баравіковай, Галіне Каржанеўскай і многім іншым. З гэтай нагоды М.Яцкоў прапанаваў патэлефанаваць у Мінск вядомай беларускай паэтэсе Галіне Каржанеўскай – і праз імгненне брылёўскія слухачы пачулі голас Галіны Анатольеўны і яе ўспаміны аб сустрэчах з Еўдакіяй Лось, аб тым, якое месца яна займала ў «мужчынскай» беларускай літаратуры пачатку 1960-х г.г. Спадарыня Галіна напрыканцы павіншавала ўсіх з надыходам вясны і пажадала ўсяго самага найлепшага.





УШАЧСКАЯ ЦЕНТРАЛЬНАЯ РАЙОННАЯ БИБЛИОТЕКА
Наш адрес: Ушачи, ул.Ленинская, 32
тел. 8 (02158) 5 17 74

Copyright © Wondershare Software

*Главная* **Новости** *Коллегам* *Пользователям* *Мультимедийный центр* *ПЦПИ* *"Сакавіны"* *Афиша* *Библиобус*

*Анненская ярмарка* *Краеведение* *Детская страничка* *Наши достижения* *Контакты* *Архив* *Электронный каталог*

## Государственное учреждение культуры "Зельвенская районная библиотека"



**Вельмі прыемна, што нашага земляка Уладзіміра Мазго ведаюць і шануюць не толькі на Зэльвеншчыне...**

6 сакавіка 2019 года ў Брылёўскай сельскай бібліятэцы Магілёўскага раёна адбылася літаратурна-музычная імпрэза "Таямнічая планета Уладзіміра Мазго".

Бібліятэкар Юлія Яцкова распавяла пра жыццёвыя набыткі і творчасць юбіляра, пра трапяткія адносіны да мілагучнай роднай мовы, якая новымі адценнямі і фарбамі зазіхацела ў ягоных творах. Асабліва шмат Уладзімір Мазго робіць для дзяцей, бо разумее, што вершаванае беларускае слова павінна як мага раней пакласціся ў падмуркі свядомасці маладога пакалення.

Дырэктар Брылёўскага сельскага Дома культуры кампазітар Мікалай Яцкоў расказаў аб сваім знаёмстве з Уладзімірам Мінавічам, аб выключнай меладычнасці яго вершаў і аб сумеснай працы над цыклам песен. Некалькі гэтых твораў прагучалі ў аўтарскім выкананні.

Прыгожым завяршэннем сустрэчы стала тэлефонная размова са спадаром Уладзімірам, які павіншаваў усіх з новай вясной, паведаміў пра свята паэзіі і музыкі "Зэльвенскія сакавіны" на яго малой радзіме і заклікаў надаваць больш увагі, берагчы і шанаваць нашу родную мову — самую прыгожую ў свеце. І апладысментамі былі сустрэты прагучаўшыя радкі:

Штогод у родныя мясціны
Прыходзіць свята "Сакавіны" -
Зямлі заспанай абуджэнне,
Вясны жаданай нараджэнне.
Пад небам светлым і высокім
Абсяг прапах вясновым сокам,
І радасць вершамі разліта
На роднай мове сакавітай.






Copyright © Wondershare Software

# Прэзентацыю падрыхтавала:

**Ю.М.Яцкова – біліятэкар 1 катэгорыі Брылёўскай сельскай бібліятэкі**

Copyright © Wondershare Software

# Дзякуем за ўвагу!



Copyright © Wondershare Software